опасность перехода в *стадию надлома*, которая, как правило, необходимо сменяется *стадией распада*. Распавшись, цивилизация либо исчезает с лица Земли (египетская цивилизация, цивилизация Инков) либо дает жизнь новым локальным цивилизационным образованиям (эллинская цивилизация, породившая через вселенскую церковь западное и православное христианство). Однако А. Тойнби не признает неизбежной предопределенности в социодинамике цивилизаций, предрекающих их неминуемую гибель. Конструктивное преодоление кризисных явлений, вызовов способствует не гибели, а *преображению цивилизации,* гарантом которого выступает не технико-технологическое, экономическое или политическое развитие, а нравственно-религиозное обновление [1, с. 773–784].

**Заключение.** Обобщая изложенные нами положения теории исторического развития цивилизаций Тойнби, можно сделать вывод, согласно которому «вызов», сопровождаемый генезисом кризисных явлений, являясь закономерной фазой циклической социодинамики цивилизаций, включает в себя не только стадии социокультурной дивергенции, т.е. деструктивный элемент. Кризис – это также и возможность новых решений, переход к новому качеству, новой ценностно-нормативной системе и, соответственно, новому социальному порядку. Поэтому, наряду со стадиями социокультурной нестабильности и деструкции, динамика развертывания кризисных процессов включает стадию возрождения, интеграцию социума, обусловленную процессами формирования новой системы целе- и смыслополагания. Таким образом, роль «творческого меньшинства» как носителя пассионарного потенциала и «жизненного порыва» является определяющей для последующей судьбы локальной цивилизации. Кризисные этапы являются необходимой фазой циклической динамики цивилизаций, позитивное разрешение которых посредством религиозного обновления способствует ее совершенствованию и развитию на новом, более высоком качественном уровне.

1. Тойнби, А.Дж. Исследование истории / А.Дж. Тойнби; пер. с англ. К.Я. Кожурина. – М. : АСТ: АСТ МОСКВА, 2010. – 1119, [1] с.
2. Тойнби, А. Дж. Цивилизация перед судом истории: Сборник / Пер. с англ. – 2-е изд / А.Дж. Тойнби. – М.: Айрис-пресс, 2003. – 592 с.

## АСАБЛІВАСЦІ БЕЛАРУСКАГА ВЯСЕЛЬНАГА АБРАДУ

***Кроцікава М.В.,***
*магістрант ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Цімафееў Р.У., канд. гіст. навук, дацэнт*

Вяселле ў традыцыйным беларускім стылі - сёння рэч досыць модная і распаўсюджаная. Аднак у XXI стагоддзі вяселле перажывае розныя змены: светапогляднага, структурнага, ідэалагічнага характару. Таму даследаванне вясельнага абраду падобнага роду ўяўляецца вельмі своечасовым.

Мэтай даследчай работы у гэтай сувязі будзе выяўленне і даследаванне асаблівасцей абраду “Сваты” як часткі агульнага вясельнага абраду на прыкладзе традыцый в. Гарадзец Шклоўскага раёна Магілеўскай вобласці.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследвання будуць успаміны жыхароў вёсак Магілёўскай вобласці аб іх удзеле ў правядзенні вясельнага абраду, што было намі дапоўнена звесткамі з этнаграфічных прац Казаковай І., Цітаўца А., Крука І., Катовіч А., Фядосіка А., Варфаламеевай Т., а таксама ўласнымі назіраннямі. Метадамі даследавання ў нашай працы з’уляюцца гісторыка - генетычны, параўнальны, структурна – функцыянальны, якія дазваляюць разглядзець прадмет і аб’ект працы з усіх неабходных бакоў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** На працягу шматлікіх стагоддзяў вясельныя абрады займалі важнае месца ў духоўным жыцці ўсіх народаў. Гэта абраднасць узнікла ў глыбокай стажытнасці, з цягам часу многія элементы абраду былі страчаны, але галоўныя моманты захаваліся да нашых дзён.

Гісторыя вывучэння беларускага вяселля як цэласнага і складанага феномена беларускай этнакультурнай традыцыі з улікам фрагментарных згадак у старажытнарускіх летапісах налічвае больш за 1000 гадоў. Першыя згадкі пра яго сустракаюцца ўжо ў “Аповесці мінулых

гадоў" [5, с. 24]. Традыцыйна беларускі вясельны цыкл этнографы ўмоўна падзяляюць на тры асноўныя перыяды: перадвясельны (ад сватаўства да дзявочніка); вясельны (вяселле і шлюбная ноч); паслявясельны [4, с. 33]. Кожны з пералічаных этапаў пераследваў свае мэты і вырашаў канкрэтныя сацыякультурныя задачы.

Перадвясельны перыяд прадугледжваў правядзенне шэрагу рытуальна-абрадавых дзеянняў і ўключаў у сябе некалькі этапаў: перамовы паміж бацькамі жаніха і нявесты аб сватаўстве, дзявочнік, непасрэдна сам абрад сваты. На Магілёўшчыне ў некаторых рэгіёнах напярэдадні абрада сватання арганізоўвалі сустрэчы, сэнс якіх быў наступным: выбар дня вяселля, вырашэнне бытавых і сацыяльных пытанняў аб правядзенні вяселля [2, с. 97]. Праводзілася таксама і размова аб далейшым жыцці маладых.

Выбару часу, спрыяльнаму для сватаўства і асноўным удзельнікам абраду надавалася вялікая ўвага. У в. Гарадзец, па словах Быкавай З. Ц., існавалі свае правілы выбару часу: "Стараліся ў пост не думаць аб сватаўстве, эта ж грэх, худа будзе, а как пост скончыўся, то ўжо можна засылаць сватоў".

У традыцыйнай культуры ўсходніх славян кожны дзень тыдня меў сваю характарыстыку. Як правіла, "для сватання выбіраўся шчаслівы дзень". Таксама прытрымліваліся таго, каб гэта былі цотныя дні - парнасць з'яўляецца сімвалічнай дамінантай ў змесце пераважнай большасці вясельных абрадаў [5, с. 206]."Уважліва глядзелі, каб дзень калі ехалі сватацца быў цотны, эта як сімвал пары, а калі няцот, то думалі, што няшчасце будзе, не заладзіцца, хтосьці з пары адзін застанецца"- успамінае Букетава Г. Т.

Імкнуліся не сватацца, а значыць, і не граць вяселля ў высакосным годзе, аб чым сведчаць словы Кроцікава А. А.:"Калі вісакос, то кепска, лепей пачакаць, год не самы спрыяльны, але ўсе роўна былі вяселлі".

Сватанне - гэта першае звяно ў зіхатлівым ланцугу вясельнай абраднасці. Сваёй формай яно нагадвала гандлёвую спрэчку. Як сцвярджаюць даследчыкі гісторыі вясельнай абраднасці, гэта нешта іншае, як перажытак адной са старажытных формаў шлюбу – куплі-продажу нявесты:"У дом заходзілі і казалі: у вас тавар, у нас купец, у вас цялушка, у нас бычок" – распавядае нам Букетава Г.Т.

Пасля непрацяглых "перамоваў", падчас якіх бацькі нявесты давалі згоду "на куплю тавару", у т. л. на шлюб паміж маладымі людзьмі, усе рассаджваліся за сталом і "змацоўвалі" дасягнутую дамоўленасць чаркай гарэлкі. Па пасведчаннях шматлікіх этнографаў, калі па якой-небудзь прычыне хацелі адмовіць, за стол ніколі не сядалі [7, с. 222]. Сватаўство лічылася адным з найважнейшых этапаў предвясельнага перыяду, таму што ад яго зыходу шмат у чым залежала, быць ці не быць вяселлю.

Ключавая фігура пачатковага этапа збліжэння двух радоў быў сват. Этнаграфічныя крыніцы сведчаць, што сватам мог быць мужчына, як правіла, не маладзейшы за 40 гадоў, які абавязкова мае сям'ю і сваіх дзяцей, што падцвярджаецца словамі Шалашэнь Г.В. "У сваты ніколі не бралі мужчыну, які быў жанаты некалькі раз; або мужчыну, у якога дзеці памёрлі або жонка, а то нядобрае будзе жыццё ў маладых, ен свае жыцце не ўладкаваў, значыць і іншаму не будзе спрыяць", а таксама "не бралі ў сваты чалавека з той сям'і, у якой памёр сваяк і годкі не прайшлі".

На Магілёўшчыне ў сваты часцей за ўсё ішоў бацька жаніха, падбіраючы сабе ў пару яшчэ аднаго чалавека з радні ці чужых людзей [3, с. 99]. Перад тым як ісці ў сваты, усе ўдзельнікі запланаванай місіі павінны былі сабрацца ў доме жаніха. З'яўленне свата ў доме бацькоў жаніха было адпраўной кропкай адліку новага, рытуальнага ў передвясельным перыядзе [8, с. 100]. У хаце нявесты ведаюць аб прыездзе сватоў, і калі трэба, то рыхтуюць пачастунак. Калі маладая была яшчэ не гатовая, або па нейкай прычыне ёй не падабаўся жаніх, то, часцей за ўсё, сватам веліва адмаўлялі [6, с. 70]. тлумачылі гэта тым, што дачцэ яшчэ рана замуж.

У Магілёўскай вобласці пры адмове ў шлюбе сватам "паказвалі гарбуз". Гарбуз ва ўяўленні беларусаў меў падвоенае значэнне - з аднаго боку, круглая форма гарбуза надавала здольнасць каціцца, а для сватоў пры адмове гэта быў пэўны намёк каціцца да дому [6, с. 71]. І таму ўдзельнікі сватаўства атрымоўвалі ад бацькоў маладой і яе ўласна намёк крыху паастыць. Калі бацькі і дзяўчына не адказвалі сватам, то прытрымліваючыся беларускага менталітэту, сфармуляванаму на працягу шматлікіх стагоддзяў, трэба было замацаваць любое перамір'е, пагадненне, дамоўленасць адпаведным рытуалам - сумесным распіццём гарэлкі [1, с. 85]. Таму, менавіта з гэтай нагоды і пачыналі рыхтаваць святочны стол для сватоў.



Репозиторий ВГУ

Пасля правядзення абрада сватаўства, нявесце і жаніху прадастаўляўся час для знаёмства з сем’ямі адзін аднаго. Важным момантам у перадвясельнай падрыхтоўцы было вызначэнне асноўных гасцей урачыстасці. Абавязкова трэба было абмеркаваць колькасць гасцей з абодвух бакоў, а таксама вызначыцца з каравайніцамі - тымі, хто будзе выпякаць вясельны каравай па ўсіх правілах улічваючы векавыя традыцыі народа. Пасля сватоў для сем’яў маладых пачынаўся перыяд падрыхтоўкі дня вяселля.

**Заключэнне.** Такім чынам дамоўленасць, дасягнутая паміж сватамі і бацькамі дзяўчыны, а таксама невялікае застолле, прымеркаванае да гэтай падзеі, набывалі лёсавызначальны характар – пасля сватаўства дзяўчына і хлопец адкрыта называліся нарачонымі, але ўсе ж такі важна падкрэсліць, што нават пасля сватання вяселле яшчэ не павінна было абавязкова спраўляцца.


1. Казакова, І. В. Традыцыйная сямейная абраднасць беларусаў: вясельны абрад / І. В. Казакова // Народная асвета. – 2007. – № 9. – С. 84 – 88.
2. Казакова. І. На парозе жыцця: агульнасць сімволікі сямейна- абрадавага комплексу беларусаў / І. Казакова // Роднае слова. – 2009. – № 1. – С. 96 – 99.
3. Каспяровіч, В. Сімвалы беларускага вяселля / В. Каспяровіч // Роднае слова. – 2005. – № 4. – С. 98 – 102.
4. Котович, О. В. Белорусская свадьба в пространстве традиционной культуры / О. Котович, Я. Крук. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2012. – 848 с.
5. Крук, Я. Традиционная белорусская свадьба / Я. Крук // Нёман. – 2000. - № 8. – С. 202 – 225.
6. Титовец, А. В.Традиционная культура белорусов во времени и пространстве / А. В. Титовец [и др.]; под ред. А. В. Титовца. – Минск: Беларуская навука, 2013. – 579 с.
7. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2001. – Т. 1. Магілеўскае Падняпроўе. –797 с.
8. Фядосік, А. Заручыны ў традыцыйнай беларускай вясельнай абраднасці / А. Фядосік // Роднае слова. – 2006.– № 2. – С. 99 –100.


## О РОЛИ ЛИЧНОСТИ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЯ, АКЦИОНЕРА В ИНДУСТРИАЛЬНОМ ОБЩЕСТВЕ


***Кулаков Г.И.,***

*студент ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*

*Научный руководитель – Кулаков И.Д., доцент*


Одна из важнейших проблем: отношения личности и общества. В этой связи для нас представляет научный интерес книга американского экономиста Джона Гелбрейта «Новое индустриальное общество» [1], в которой показывается, в частности, роль личности предпринимателя, акционера в бизнесе в условиях капитализма, в том числе на индустриальной фазе его развития.

Цель исследования*:* конкретизировать представления о буржуазном типе личности, с учётом социальных следствий предпринимательской деятельности в её чистом, «классическом» (Гелбрейт) виде в условиях дотехнократического периода. Актуальность: важность изучения личности предпринимателя на разных ступенях развития общества, в связи с начавшимся развитием предпринимательства на постсоветском пространстве.

**Материал и методы.** Используется материал книги «Новое индустриальное общество» Дж. Гелбрейта, а также «Капитала» К. Маркса. Применяются методы описания и обобщения.

**Результаты и их обсуждение.** В аспекте интересующего нас вопроса Гелбрейт рассматривает две формы управления. Первая, наиболее простая – с незначительным предложением капитала (например – «продажа бензина или выращивание яблок») при достаточно надёжном функционирующем рынке, небольшой нужде в планировании, специализированной информации и связанным с ней кадровым аппаратом [1, с. 129]. Такое предприятие с держателями акций, являясь мелкой корпорацией, не в состоянии влиять на цены, по которым оно покупает чужие или продаёт свои товары. Поэтому *акционерам не обойтись без тревог и беспокойства. Но* есть и плюсы: во-первых, позволяя фирме *сэкономить силы и умственную энергию;* во-вторых, *право их голоса имеет неформальное значение,* позволяющее стоять на страже своей собственности. «И поскольку в мелкой фирме решения, касающиеся производства, … не отличаются сложностью, - заключает он, - для всего процесса управления ею вполне *достаточно умственного багажа главного держателя акций* (курсив наш. – И.К.)» [1, с. 130]. Стало быть, мелкой системе хозяйствования, несложным орудиям и средствам труда соответствует простая форма управления *с единоличным*

Репозиторий ВГУ